# Чалавек і вайна: бінарны ўрок па аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык»

**В. В. Балышэва,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
вышэйшай катэгорыі
СШ № 6 г. Пінска
**Л. Р. Напяркоўская,**
настаўнік гісторыі
вышэйшай катэгорыі
СШ № 6 г. Пінска

**Мэта:** пазнаёміць вучняў з гісторыяй напісання аповесці, часам, падзеямі, якія адлюстраваны ў аповесці; стварыць умовы для ўспрымання твора.

**Задачы:** пазнаёміць вучняў з біяграфіяй В.Быкава, звярнуць увагу на асноўную тэму яго творчасці, на глыбокае веданне пісьменнікам псіхалогіі людзей на вайне; стварыць першаснае ўспрыманне аб Вялікай Айчыннай вайне, гераізме і мужнасці байцоў;

фарміраваць першаснае ўяўленне пра жанравую своеасаблівасць твора; абмеркаваць уражанні вучняў ад прачытанай аповесці. Развіваць уменне аналізаваць і рабіць высновы ў працэсе навучання, работаць з картай.

Выхоўваць пачуцці патрыятызму і адданасці сваёй радзіме, фарміраваць гістарычную памяць, развіваць цікавасць да сучаснасці і будучыні сваёй краіны.

**І.Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Добры дзень, паважаныя вучні і шаноўныя госці. На сённяшнім уроку жадаю вам плённай і творчай працы. Вызначыць тэму гаворкі вам дапаможа верш Людмілы Воранавай “Краіны мае абеліскі...” ў выкананні вучня групы **“Творцы”**

Вучань чытае верш на памяць (гучыць музыка).

Краіны мае абеліскі.
Блішчаць, быццам зоркі ў цьме,
Галосіць над імі вятрыска,
Расказвае нам аб вайне…
Ідуць вераніцаю людзі
Да гэтых каменных святынь.
І будуць ісці, пакуль будзе
Зіхцець гэтых зор калярынь..

Трапечацца вечны агеньчык,
Як сэрцы палёглых салдат…
Чытае ўнучка свой вершык
Пра час, што не вернеш назад,
Пра дзеда, які не вярнуўся
Да дому з пякельнай вайны
У вёсачку, што ў Беларусі…
А хіба ж, такія адны?..
Іх многа! Не сотні!..Мільёны! -
Схаваны пад глыбамі пліт -
Жаўцяць пазалотай імёны,
Ахоўвае памяць граніт…

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Якое ўражанне пакінуў у вас пачуты твор? Пра што мы будзем гаварыць на сённяшнім уроку? Якія вобразы вам дапамаглі зрабіць такія вывады?

**Настаўнік гісторыі:** Сапраўды, Вялікая Айчынная вайна – адна з трагічных старонак у гісторыі нашай краіны. У час вайны загінула больш за тры мільёны беларусаў, былі знішчаны цэлыя гарады, вёскі. Ні вы, ні я, на шчасце, не былі сведкамі тых жудасных падзей. А як мы можам даведацца пра гэты змрочны час? (**Адказы вучняў:** праз прагляд фільмаў, размову са сведкамі вайны, кнігі).

Вы бачыце кніжную выставу, на якой сабрана літаратура, якая расказвае пра тыя змрочныя, жудасныя часы. З гэтымі кнігамі вы можаце пазнаёміцца пасля ўрока.

**II. Тэма ўрока. Мэтавызначэнне.**

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Сённяшні ўрок мы прысвячаем памяці В.Быкава, памяці вашых дзедаў, прадзедаў, усіх тых, хто бачыў вайну, ваяваў, перажыў яе. Мы паспрабуем у думках перанесціся ў той далёкі ваенны час, сведкамі і ўдзельнікамі якога былі людзі, якіх засталося вельмі мала, але яны, на шчасце, яшчэ жывуць сярод нас. Дапаможа нам у гэтым твор былога франтавіка, народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава - аповесць “Жураўлінын крык”.

Давайце акрэслім задачы, якія павінны рашыць на гэтым уроку. Выкарыстайце пры гэтым апорныя словы.

**Апорныя словы:** пазнаёміцца, раскрыць, даваць, паглыбіць, выказаць, даследаваць, знаходзіць, параўнаць, развіваць, дзяліцца, выхоўваць, высветліць, адзначыць, выявіць, вызначыць.

**III. Новы матэрыял.**

**Настаўнік гісторыі:** Сёння на ўроку мы зробім крок да нашай гістарычнай памяці. Каб стварыць будучае, трэба помніць мінулае. Таму сёння мы зноў гаворым пра вайну.

А што значыць вайна для вас, пакалення XXI стагоддзя? Падбярыце і запішыце асацыяцыі да слова “вайна”. Якія словы суседа па парце вам спадабаліся? Дапішыце іх сабе.

"Вайна ёсць працяг палітыкі іншымі сродкамі". Войны бываюць розныя. Папрацуйце ў групах і паспрабуйце запоўніць карту-схему класіфікацыі войнаў.

Войны бываюць: зыходзячы з мэт, іх дзеляць на рабаўніцкія, заваявальныя, каланіяльныя, рэлігійныя, дынастычныя, гандлёвыя, нацыянальна-вызваленчыя, патрыятычныя (Айчынная вайна 1812), рэвалюцыйныя .

Па размаху ваенных дзеянняў і колькасці сіл і сродкаў, якія ў іх задзейнічаны, войны дзеляцца на лакальныя і буйнамаштабныя.

Па характары супрацьлеглых бакоў адрозніваюць грамадзянскія і знешнія вайны. Акрамя таго, войны адрозніваюць па спосабах вядзення – наступальныя і абарончыя, рэгулярныя і партызанскія (герылья)

Па месцы вядзення: сухапутныя, марскія, паветраныя, берагавыя, прыгонныя і палявыя, да якіх часам дадаюць таксама арктычныя, горныя, гарадскія, войны ў пустыні, войны ў джунглях.

У якасці прынцыпу класіфікацыі бярэцца і маральны крытэрый – справядлівыя і несправядлівыя войны.

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Скажыце, ці ёсць такія групы, якія амаль цалкам справіліся з гэтым заданнем? Да дадзенай класіфікацыі вы яшчэ вернецеся на ўроках гісторыі.

**Настаўнік гісторыі:** Уявіце, за ўвесь час існавання чалавецтва толькі 50 год былі мірнымі. Але самай жудаснай для беларускага народа была Вялікая Айчынная вайна.

Чаму гэта вайна атрымала такую назву?

На вашых сталах ёсць ілюстрацыйны матэрыял, гістарычныя цытаты, выказванні дзеячаў гісторыі, выберыце тыя, якія маюць дачыненне да нашай тэмы, тэмы Вялікай Айчыннай вайны.

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Цэнтральная тэма творчасці В.Быкава – вайна. **“Вайна – самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі… Яна не павінна паўтарыцца”**, - пісаў *Васіль Быкаў.*

Як вы разумееце сэнс гэтых слоў? *(Будучы жывым сведкам тых страшных падзей, пісьменнік усведамляе сваю адказнасць перад цяперашнім і будучым пакаленнямі за аб’ектыўны мастацкі летапіс эпохі)*

**Настаўнік гісторыі: Фізкультхвілінка.**

Падыміце правую руку тыя, у каго прадзеды ваявалі на вайне?

Падыміце левую руку тыя, хто ведае пра страты сваёй сям’і ў час ВАв?

Ціхенька падыміцеся тыя, у каго родныя ў час вайны былі вязнямі канцлагераў?

Сцісніце кулакі тыя, хто чуў расказы пра вайну ад родных або ад чужых людзей?

**Настаўнік беларускай літаратуры:** З творчасцю Васіля Быкава мы сустракаемся не ў першы раз. Назавіце апавяданне гэтага аўтара, якое мы вывучалі ў сёмым класе. (В.Быкаў “Незагойная рана”). Гэта апавяданне таксама прысвечана тэме ВАв.

Для таго каб зразумець аўтара, трэба ведаць, чым ён жыў, якія выпрабаванні пераадолеў. Давайце пазнаёмімся з жыццём нашага выдатнага пісьменніка.

Для гэтага паслухаем справаздачы груп **“Літаратары”** і **“Гісторыкі”** аб выкананні дамашняга задання.

**“Літаратары”:** наша група рыхтавала паведамленні пра жыццё В.Быкава. Усе заданні выканалі. Лепшае выступленне мы лічым у Французавай Н.

**“Гісторыкі”:** наша група рыхтавала карту жыцця В.Быкава. Больш за ўсіх фактаў з біяграфіі В.Быкава знайшла і адзначыла на карце Івашкевіч Аліса.

Н.: Слухаючы справаздачы груп, запоўніце табліцу “Біяграфія В.Быкава”.

**Настаўнік гісторыі:** Яшчэ адна спадчына, якую пакінуў нам В.Быкаў, - карты, намаляваныя самім пісьменнікам. Не ігральныя, зразумела, а геаграфічныя... Ён маляваў іх усё жыццё. Звычка яшчэ з ваеннага юнацтва. Вядомы выпадак: у пачатку вайны будучы класік адстаў ад свайго атрада, яго схапілі свае ж, і, знайшоўшы самаробную карту, вырашылі, што хлопец-шпіён. Толькі цудам удалося В.Быкаву пазбегнуць расстрэлу.

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Пасля выканання табліца павінна выглядаць наступным чынам (табліца на экране).

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Значнай з'явай у літаратуры стала аповесць В.Быкава «Жураўліны крык» (1959), якая прынесла празаіку трывалае і цалкам заслужанае прызнанне. «"Жураўліны крык" - першы ва ўсіх адносінах тыповы для Васіля Быкава твор.

**V. Псіхалагічная хвіліна.**

Па аповесці “Жураўліны крык” зняты фільм. Сёння мы маем мажлівасць убачыць некалькі кадраў з гэтага фільма.

**VI. Работа ў групах.**

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Зараз вы папрацуеце ў групах і выканаеце прапанаваныя заданні. На гэта вам даецца 3-4 хвіліны.

**І група**

**Настаўнік беларускай літаратуры:** У жанравых адносінах “Жураўліны крык” – гэта аповесць. Вызначце рысы, якія характэрныя гэтаму жанру (прыём “Ланцужок”: ланцужок не павінен разарвацца, усе вучні групы павінны даць свой адказ, правільныя варыянты выбіраюцца з прапанаваных).

аповесць – гэта адзін з асноўных жанраў эпічнай літаратуры;

яна значна большая за апавяданне;

сюжэт яе складаецца з некалькіх эпізодаў, звязаных з жыццём аднаго або некалькіх герояў;

сюжэт аповесці больш складаны, чым сюжэт апавядання;

у аповесці расказваецца пра адзін чалавечы лёс, але ён цесна звязаны з лёсам іншых людзей.

**Настаўнік беларускай літаратуры:** З усяго сказанага, мы робім вывад, што аповесць — мастацкі твор, пераважна празаічны, у якім расказваецца пра шэраг важных падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі.

Зараз мы ўспомнілі асноўныя рысы аповесці. Аповесці В. Быкава маюць свае асаблівасці. Пра іх мы пагаворым на апошнім уроку, калі вывучым увесь твор.

**II група**

1. Скончы фразу:

Дзеянне аповесці адбываецца … (восенню 1941 года пад Смаленскам)

Савецкія войскі … (адступалі)

Шэсць салдат атрымалі заданне … (затрымаць немцаў на суткі, каб даць магчымасць батальёну адступіць )

Камандзірам быў прызначаны … (старшына Карпенка)

Ён быў не задаволены … (байцамі і адсутнасцю рыдлёвак)

Байцоў і зброі было мала, сілы няроўныя, але ж заданне камбата было…(выканана)

Усе героі аповесці… (загінулі)

**Настаўнік беларускай літаратуры:** У аповесці ўпамінаюцца і іншыя населеныя пункты. З якімі падзеямі яны звязаны, раскажа Іванцоў Уладзіслаў.

**Хвілінка гісторыі: <u>Карта падзей аповесці "Жураўліны крык</u>"**.

У аповесці ваенныя падзеі адбываюцца каля весак Тодараўцы (Баранавіцкага раёна) і вёскі Баравічы Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, пад Смаленскам.
Таксама магчыма прасачыць жыццевы шлях герояў.
Жыццевы шлях Пшанічнага- горад Бранск, Данбас, Сібір.
Свіст родам з Саратава, любіў кататся па Волзе на байдарцы, пілаваў лес у Сібіры, быў на Сахаліне.
Глечык родам з Віцебска, вучыўся ў Смаленску.
Карпенка родам з Арлоўшчыны, ваяваў у фінскую, у гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў пад Лепелем.
Фішар гадаваўся у Ленінградзе.
А зараз яны усе разам выконваюць свой абавязак.

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Дапоўніць Людміла Рыгораўна.

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Мы бачым, што сюжэт аповесці просты і складаецца з аднаго эпізода: група людзей пакінута на чыгуначным пераездзе, каб на суткі перакрыць дарогу ворагам. Але ў аповесці падаецца шэраг чалавечых лёсаў, характараў. Давайце з імі пазнаёмімся.

**III група**

Падабраць з 1 часткі аповесці радкі для гульні "Пазнай героя па яго апісанні".

1. "Мужны,прысадзісты, шыракатвары, з рашучымі вачыма і цяжкімі сківіцамі"(Карпенка)
2. "Вучоны", у акулярах, высокі, сутулы баец….(Фішар)
3. "Няўдака, малады, са свежымі сумнымі вачыма,,,.(Глечык)
4. "Белабрысы, расшпілены на ўсе кручкі і гузікі, жулікаваты з выгляду хлопец".(Свіст)
5. "Непаваротлівы, мардаты, з пухлай далонню баец".(Пшанічны)
6. "Чарнявы, прыгожы малады баец"(Аўсееў)

**Настаўнік беларускай літаратуры:** На наступных уроках мы даведаемся аб даваенным жыцці кожнага з герояў. Убачым, як паводзіць сябе кожны з іх у экстрэмальнай сітуацыі.

**VII. Творчасць.**

**Настаўнік гісторыі:** Каб стварыць будучае, трэба помніць мінулае. Кажуць, новая вайна будзе, калі народзіцца пакаленне, якое забудзе, што такое вайна.

Складзіце сінквейн са словам "памяць".

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Паслухаем верш **Вольгі Лойка "Памяць нашай крыві"** (Нікуліна К.)

Не была на вайне ніколі,
не хавалася ў раўках,
але ў сэрцы жыве з маленства
перад жудасным часам страх.
У начы палыхне зарніцаю,
адгукнецца ў спіну "стой!"
Гэта памяць ідзе навальніцаю,
памяць нашай крыві з табой.
Засланяюць на небе сонца
мне армады жалезных крыл,
і бягу, ад іх не схавацца...
Мне б праснуцца хапіла сіл...
І таму кінастужкі хронікі
ўжо мінулай даўно вайны

не гляджу, апускаю позірк я:
так балюча ад той бяды.
Не была на вайне ніколі
і не дай жа нам Бог спазнаць,
як пальецца чырвонай стужкаю
кроў з жаданнем не ваяваць.

**VIII. Дамашняе заданне.**

1. Перачытаць 1,2 раздзелы аповесці “Жураўліны крык” В.Быкава, знайсці ў тэксце радкі, дзе ўпершыню расказваецца пра герояў твора.

2. Падрыхтаваць ілюстрацыі да раздзелаў 1,2.

**IX. Рэфлексія.**

**Настаўнік беларускай літаратуры:** Дзякуй за добрую працу. Калі тэма нашага ўрока вас усхвалявала, прымацуйце да дошкі белага жураўліка, калі не – чорнага.

Запоўні табліцу:

| | |
|---|---|
| 1924 г. | Нарадзіўся ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. |
| 1939 г. | Віцебскае мастацкае вучылішча |
| 1943 г. | Скончыў пяхотнае вучылішча ў Саратаве |
| 1944 г. | раненні |
| З 1947 г. | Пасля дэмабілізацыі В. Быкаў жыў у Гродне , працаваў мастаком у гродзенскіх майстэрнях, у рэдакцыі абласной газеты «Гродзенская праўда». |
| 1949 г. | Першыя апавяданні |
| 1978 г. | Пераехаў у Мінск |
| 1998 г. | Васіль Быкаў вырашыў пажыць у Фінляндыі, куды пераязджае з жонкай. |
| 2002 г. | Чэхія |
| 2003 г. | Памёр ў 20 гадзін 30 хвілін у рэанімацыйным аддзяленні анкалагічнага шпіталю ў Бараўлянах. Пад Мінскам. |




ОДВИГ НАРОДА
БЕС



# Васіль Уладзіміравіч Быкаў

**Пазнаёміцца, раскрыць, даваць, паглыбіць, выказаць, даследаваць, развіваць, параўнаць, дзяліцца, высветліць, адзначыць, выявіць, вызначыць, выхоўваць.**

# Вайна…



**Класіфікацыя войнаў:**

Зыходзячы з **мэт,** іх дзеляць на рабаўніцкія, заваявальныя, каланіяльныя, рэлігійныя, дынастычныя, гандлёвыя, нацыянальна-вызваленчыя, патрыятычныя (Айчынная вайна 1812), рэвалюцыйныя.

**Па размаху ваенных дзеянняў і колькасці сіл і сродкаў, якія ў іх задзейнічаны,** войны дзеляцца на лакальныя і буйнамаштабныя.

**Па характары супрацьлеглых бакоў** адрозніваюць грамадзянскія і знешнія вайны.

Войны адрозніваюць **па спосабах вядзення** – наступальныя і абарончыя, рэгулярныя і партызанскія (герылья);

**па месцы вядзення:** сухапутныя, марскія, паветраныя, берагавыя, прыгонныя і палявыя, да якіх часам дадаюць таксама арктычныя, горныя, гарадскія, войны ў пустыні, войны ў джунглях.

У якасці прынцыпу класіфікацыі бярэцца і **маральны крытэрый** – справядлівыя і несправядлівыя войны.



# ВАСІЛЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ БЫКАЎ (1924-2003)




БІЯГРАФІЯ











# Творы Васіля Быкава












| | |
|---|---|
| **19 чэрвеня 1924 г.** | Нарадзіўся ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. |
| 1939 г. | **Паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскай мастацкай вучэльні** |
| **1940г.** | Вучыўся ў пяхотным вучылішчы ў Саратаве |
| 1944 г. | **Тры месяцы знаходзіўся ў шпіталі** |
| **1947 г.** | Пасля дэмабілізацыі В. Быкаў жыў у Гродне, працаваў мастаком у гродзенскіх майстэрнях, у рэдакцыі абласной газеты «Гродзенская праўда». |
| 1949 г. | **У "Гродзенскай праўдзе" былі надрукаваныя першыя апавяданні В.Быкава.** |
| 1978г. | **Пераехаў на сталае жыццё ў Мінск.** |
| **У пачатку 1998 г.** | Васіль Быкаў вырашыў пажыць у Фінляндыі, куды пераязджае з жонкай. |
| 2002 г. | Пасяліўся ў Чэхіі, перад гэтым пэўны час жыў у Германіі. |
| **22 чэрвеня 2003 года** | Памёр у анкалагічным шпіталі ў Бараўлянах пад Мінскам. |
| | |




colorize-it.com
svaboda.org (RFE/RL)



| |
|---|
| **гэта адзін з асноўных жанраў эпічнай літаратуры;** |
| **гэта адзін з асноўных жанраў лірычнай літаратуры;** |
| **яна значна большая за апавяданне;** |
| **яна значна меншая за апавяданне;** |
| **сюжэт яе складаецца з некалькіх эпізодаў, звязаных з жыццём аднаго або некалькіх герояў;** |
| **невялікі твор, у якім расказваецца, як правіла, пра адзін вызначальны выпадак з жыцця чалавека;** |
| **сюжэт больш складаны, чым сюжэт апавядання;** |
| **расказваецца пра адзін чалавечы лёс, але ён цесна звязаны з лёсам іншых людзей;** |
| **невялікі твор, які расказвае пра напружанае, выключнае здарэнне ў жыцці чалавека і мае нечаканую развязку;** |
| **род літаратуры, які адлюстроўвае рэчаіснасць праз суб’ектыўнае выяўленне пачуццяў, перажыванняў аўтара;** |

Дзеянне аповесці адбываецца … (дзе? калі?)

Савецкія войскі …

Шасцёра салдат атрымалі заданне …

Камандзірам быў прызначаны …

Ён быў не задаволены …

Байцоў і зброі было мала, сілы няроўныя, але ж заданне камбата было…

Усе героі аповесці…




**Менавіта тут у 50 з лішнім кіламетрах паўднёва-захад ад Віцебска 6 ліпеня 1941 года ў жорсткім крывавым баі сышліся не на жыццё, а на смерць больш за дзве тысячы баявых машын СССР і Трэцяга рэйха**



1. **Памяць.**
2. 2 прыметнікі.
3. 3 дзеясловы.
4. Сказ (адносіны да тэмы).
5. Слова-рэзюмэ.


1941-1945

**Дамашняе заданне**

1. Перачытаць 1, 2 раздзелы аповесці “Жураўліны крык” В. Быкава, знайсці ў тэксце радкі, дзе ўпершыню расказваецца пра герояў твора.
2. Падрыхтаваць ілюстрацыі да раздзелаў 1, 2
3.Параўнаць Айчынную вайну 1812 г. і Вялікую Айчынную вайну.



9 МАЯ
Никто
не забыт
ничто
не забыто
вечная
память...